ДзУК «Пінская гарадская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»
бібліятэка-філіял № 1

# « У думках, у сэрцах, у песнях»

(да 135-годдзя з дня нараджэння
Я. Коласа і Я. Купалы )

Пінск, 2017

# Паважаныя чытачы!

Сёлета ў нашай краіне адзначаецца 135-годдзе вялікіх песняроў, класікаў беларускай літаратуры Янкі Купалы і Якуба Коласа. “Творчасць Янкі Купалы і Якуба Коласа – гэта тыя вежы, з якіх мы, беларусы, бачым цэлы свет, і па якіх свет бачыць нас”, – так трапна вызначыў ролю нашых славутых песняроў беларускі паэт, празаік, перакладчык Віктар Шніп. І з гэтым цяжка не пагадзіцца. Якуб Колас і Янка Купала – выразнікі нацыянальнай самасвядомасці, народных пачуццяў. У сваіх творах яны раскрылі нацыянальны характар, асаблівасці духоўнага складу і жыцця беларусаў, выявілі незвычайную сілу і творчую магутнасць беларускага слова.

З нагоды гэтай значнай даты, мы падрыхтавалі для Вас маленькую частку вялікай Спадчыны волатаў беларускага народнага слова. І з гонарам запрашаем Вас пазнаёміцца з лепшымі выданнямі нашых знакамітых класікаў.

# Якуб Колас

# (1882-1956гг.)






**Мушынскі, М. І. Летапіс жыцця і творчасці Якуба Коласа / М. І. Мушынскі; навуковы рэдактар А. М. Макарэвіч. – Мінск: Беларуская навука, 2012. – 1127 с.**

Кніга, якая прапануецца ўвазе чытача, у храналагічнай паслядоўнасці прадстаўляе факты жыцця і творчай дзейнасці вялікага песняра, адлюстроўвае яго разнастайныя сувязі з эпохай, узнаўляе грамадска-бытавы фон, рэальнае асяроддзе, у якім даводзілася жыць і працаваць. Раскрываюцца асобныя моманты псіхалогіі творчасці, асаблівасці індывідуальнай пісьменніцкай манеры, адметнасць светаўспрымання. Адрасаваны «Летапіс…» шырокай чытацкай аўдыторыі.




**Жыгоцкі, М. Якуб Колас і легендарны дзед Талаш: нарысы / Мікола Жыгоцкі. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2012. – 254 с.**

У кнізе разглядаюцца жыццё і дзейнасць класіка беларускай літаратуры Якуба Коласа і двойчы партызана Васіля Талаша, вобраз якога адлюстраваны ў знаёмай чытачу аповесці «Дрыгва». Аналізуецца публіцыстыка і паэзія песняра. Асаблівай увагі чытачоў заслугоўваюць сведчанні людзей, якія ведалі паэта і партызана асабіста. Пры падрыхтоўцы кнігі аўтары выкарыстоўвалі разнастайныя дакуметальныя крыніцы, што робіць выданне ўнікальным і інфарматыўным. Кніга будзе цікавай для чытачоў рознага ўзросту.




**Колас, Я. Выбраныя творы / Якуб Колас; укладанне, прадмова, каментарыі М. Тычыны. – Мінск: Кнігазбор, 2007. – 720 с. [8] с.: іл. – («Беларускі кнігазбор»: Серыя 1. Мастацкая літаратура).**

У аднатомнік увайшлі найбольш значныя творы народнага пісьменніка. Чытач мае магчымасць пазнаёміцца з яго цудоўнай паэзіяй: вершамі («Наш родны край», Беларусам», «Нёман» і інш.) паэмамі («Сымон-музыка», «Новая зямля»). Публіцыстычны матэрыял, змешчаны ў зборніку, дазваляе больш глыбока пазнаёміцца з творчасцю Я. Коласа.

Кніга дае добрае прадстаўленне пра выдатны талент класіка нашай літаратуры, таму будзе цікава шырокаму колу чытачоў.




**Колас, Я. Другое чытанне для дзяцей беларусаў: апавядянні, вершы, байкі, казкі / Якуб Колас; прадмова І. М. Саматыі; падрыхтоўка тэкстаў Т. Р. Строевай; мастак С. І. Чарановіч. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2007. – 182 с., іл.**

Гэта самая першая кніга будучага народнага пісьменніка Беларусі, якая адрасавана маленькаму чытачу дзеля навучання роднай мове. Выкарыстоўваючы розныя літаратурныя жанры, аўтар жадае абудзіць у маленькага чалавека здольнасць бачыць, любіць і ствараць вакол сябе прыгажосць, адказна ставіцца да свайго жыцця, любіць і паважаць свой родны край, мову і ўсіх, хто побач. Камічныя сюжэты, трапныя запамінальныя дыялогі выдатна спалучаюцца з псіхалагізмам аўтара. Кніга будзе сапраўднай знаходкай для дзяцей і іх бацькоў.

**Колас, Я. Раніца ў нядзельку. Казкі жыцця / Якуб Колас; мастак П. М. Драчоў. – Мінск: Лазурак, 1997. – 288 с.**




Упершыню пад адной вокладкай змешчаны асобныя, адаптаваныя для дзіцячага ўзросту, раздзелы з паэмы «Новая зямля» і дзіцячыя вершы аўтара. Значнае месца ў зборніку займаюць алегарычныя апавяданні «Казкі жыцця». Яны аб’ядноўваюць у сабе філасофскую мудрасць прытчаў, павучальнасць баек, вобразнасць фальклорных твораў. Казкі вучаць нас па-філасофску адносіцца да жыцця, прымушаюць выступаць супраць бяздзейнасці і духоўнай слепаты чалавека, заклікаюць жыць ярка. Выданне адрасавана дзецям сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту, а таксама цікаўным дарослым.




**Колас, Я. Пісаравы імяніны: гумарыстычныя апавяданні для старэйшага школьнага ўзросту / Якуб Колас; укладанне і прадмова Ю. Пацюпы. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2008. – 263 с. – (Бібліятэка школьніка).**

У кнігу класіка беларускай літаратуры Якуба Коласа ўвайшлі ўсе гумарыстычныя і сатырычныя апавяданні, напісаныя ім у розных жанрах за розныя гады. Гэта, практычна, першае выданне, дзе падсумоўваецца Коласава смехавая проза. Кніга адкрываецца сціслым нарысам, які ўводзіць чытача ў тэорыю і гісторыю смеху. Не так і шмат мы ведаем пра Коласаў гумар, а дадзеная кніга дазволіць бліжэй з ім пазнаёміцца. Выданне адрасавана людзям з добрым пачуццём гумару.




**Колас, Я. Новая зямля: паэма: для сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту / Якуб Колас; прадмова М. Мушынскага. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2007. – 333 с. – (Бібліятэка школьніка).**

**«Новая зямля»** - лірыка-эпічная паэма, напісаная Якубам Коласам у 1911-1923 гадах, першы беларускі буйны эпічны твор. Паэма распавядае пра побыт сям'і працоўнага беларуса Міхала, пра яго вольналюбівыя мары і імкненні. Асноўнай мэтай аўтара з'яўляецца паказаць адносіны «чалавек-зямля», ён апісвае дадзеную тэму на розных узроўнях: гаспадарчыя адносіны селяніна да зямлі, зямля як гарант годнасці чалавека, як доказ яго самастойнасці, свабоды, упэўненасці ў будучыню. За «Новай зямлёй» замацавалася назва «энцыклапедыя жыцця беларускага сялянства канца XIX - пачатку XX стагоддзяў». Паэма адрасавана ўсім, хто цікавіцца гісторыяй беларускага народа.




**Колас, Я. Нёманаў дар: апавяданні, аповесць / Якуб Колас; укладанне М. Мушынскага. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2003. – 431 с. – (Беларуская проза XX стагоддзя).**

Складаны свет коласаўскага апавядання прадстаўлены ў зборніку «Неманаў дар». Цэнтральным творам, які задае тон усяму зборніку, з’яўляецца аднайменнае апавяданне. Гэта гісторыя сацыяльнай, класавай несправядлівасці, барацьбы і абароны чалавечай годнасці, дзе кожны вобраз аўтара дэманструе шматграннасць і загадкавасць душы беларуса. Вострасацыяльныя творы пісьменніка – гэта перш за ўсё магчымасць самастойнага аналізу маральных норм жыцця і спосабаў іх выкарыстання. Зборнік адрасаваны ўсім, хто цікавіцца заяўленай тэмай.




**Колас, Я. На ростанях: трылогія / Якуб Колас. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2007. – 662 с.**

**«На ростанях»** — эпічная трылогія класіка беларускай літаратуры. Адзін з першых беларускіх раманаў, які меў вялікае значэнне для развіцця жанру рамана ў беларускай літаратуры. Галоўным матывам трылогіі стала імкненне паказаць значэнне ролі інтэлігенцыі ў працэсе асэнсавання беларусамі свайго месца ў свеце, сваёй нацыянальнай самасвядомасці. Трылогія ўздымае пытанні класавых адносін у беларускіх вёсках, праблему непісьменнасці сялян тых часоў, адносіны між людзьмі. Аўтар паказвае рознакаляровую палітру грамадскага і палітычнага жыцця на фоне маляўнічых краявідаў і прыродных сцэн. Твор адрасуецца шырокаму колу чытачоў.




**Колас, Я. Дрыгва: аповесць, апавяданні: для сярэдняга школьнага ўзросту / Якуб Колас; мастак С. Л. Звяруга. – Мінск: Юнацтва, 2000. – 224 с.: іл**.

Аповесць Якуба Коласа **«Дрыгва»** заснавана на рэальных падзеях. Прататыпам галоўнага героя стаў знакаміты дзед Талаш – паляшук, рыбалоў і паляўнічы. Галоўная тэма твору – супраціўленне белапольскай акупацыі на Беларусі ў 1920 г.

Сюжэт аповесці насычаны прыгодніцкімі элементамі, што дазваляе трымаць чытача ў напружанні і прымушае перажываць за лёс герояў. Асабліва цікавай кніга будзе для тых чытачоў, хто захапляецца гісторыяй партызанскага руху на Беларусі.

# Янка Купала

## (1882-1942гг.)






**Янка Купала. «Мне сняцца сны аб Беларусі…» : успаміны, эсэ, артыкулы, дакументы / укладальнік Галіна Шаблінская. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2012. – 702 с. – (Жыццё знакамітых людей Беларусі).**

У кнізе сабраны матэрыялы, якія раскрываюць перепетыі жыццёвага і творчага лёсу песняра, заснавальніка новай беларускай літаратуры, першага народнага паэта Беларусі Янкі Купалы. Гэта ўспаміны яго сучасніка: родных і блізкіх, пісьменнікаў і навукоўцаў, дзеячоў мастацтва, культуры, а таксама простых людзей, якія сустракаліся з паэтам.

Упершыню друкуюцца тры раздзелы з манаграфіі першага біёграфа Янкі Купалы ***Льва Клейнбарта*** *«Янка Купала. Вопыт характарыстыкі літаратурнай і біяграфічнай» (1929 – 1934гг.).* Змест выдання будзе цікавы ўсім, хто жадае паглыбіць свае веды аб вялікім паэце Беларусі.




**Ліпскі, Ул. С. Янкаў вянок: дзецям пра Я. Купалу / Уладзімір Ліпскі; мастак А. Ф. Вашчанка. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2009. – 222 с.**

Кніга лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі Уладзіміра Ліпскага – гэта практычна першы, ёмісты і аб'ектыўны аповед для дзяцей пра Янку Купалу, яго радавод, нялёгкае жыццё і ўзнёслую, прарочную творчасць. Разам з аўтарам маленькія і дарослыя чытачы могуць зазірнуць у сямнаццатае стагоддзе, дзе ў невялікім маёнтку Кукялёўшчына жыў Станіслаў Луцэвіч. Быў «не вельмі важным» панам, меў шляхецкую годнасць і свой сямейны герб. Кніга адрасуецца бацькам, настаўнікам, выхавальнікам, студэнтам, школьнікам – усім тым, хто пажадае сваёй душой зразумець душу нацыянальнага Генія.




**Купала, Я. Мая малітва: выбраныя творы / Янка Купала; укладанне Г. М. Кісліцына; пад рэд Ул. А. Арлова [і інш]. – Мінск: Попурри, 2016. – 240 с. - (Мая беларуская кніга).**

Перад Вамі кніга выбранных твораў народнга песняра Беларусі Я. Купалы. Адметнасць дадзенага выдання ў яго разнастайнай тэматыцы. Так, значную частку складае патрыятычная лірыка («Мая малітва», «Над сваёй Айчызнай», «Ворагам беларушчыны») і інш.; асобныя творы класік прысвяціў аналізу нацыянальных рыс характару беларускага народу («Мужык», «За праўду»); сваё захапленне прыгажосцю роднай прыроды аўтар таксама ўвасабляе ў вершаваны радок («Мой край», «Явар і каліна», «Ноч за ночкай» ) і інш. У другой частцы выдання прадстаўлены знаёмыя чытачу п’есы Купалы-драматурга «Паўлінка», «Прымакі». Кніга адрасавана шырокаму колу чытачоў.

**Купала, Я. Расцвіла непагаснай зарой: вершы, паэмы, п’есы / Янка Купала; укладанне Віктара Шніпа. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2016. – 254 с.**




Прадстаўлены зборнік змяшчае вершы рознага жыццёвага часу мастака слова. У іх аўтар прапаноўвае свайму чытачу разам паразважаць аб вечных праблемах, з якімі сутыкаецца кожны чалавек, нягледзячы на эпоху і ўмовы жыцця: каханне, любоў да Айчыны, адказнае стаўленне да жыцця і сваіх грамадзянскіх абавязкаў. Усе гэтыя пытанні, аўтар, з уласцівым яму майстэрствам, пераўтварае ў геніяльныя вершаваныя радкі. Паэмы «Курган», «Бандароўна», «Яна і я» асвятляюць нам вечныя вобразы прыроды, кахання, гістарычнай памяці. У заключнай частцы выдання змешчаны ўжо вядомыя чытачу паэмы «Раскіданае гняздо», «Паўлінка». Кніга адрасавана шырокаму колу чытачоў.




**Купала, Я. З кутка жаданняў: вершы, паэмы, п’есы: для сярэдняга школьнага ўзросту / Янка купала. – Мінск: мастацкая літаратура, 2006. – 575 с. – (Бібліятэка школьніка).**

Літаратурна-мастацкае выданне «Бібліятэка школьніка» прапаноўвае сваім юным чытачам кнігу вершаў класіка беларускай літаратуры. Асноўны змест выдання складаюць вершы розных гадоў. Акрамя паэзіі чытачы пазнаёмяцца з адным з самых драматычных твораў беларускай літаратуры XX стагоддзя п’есай «Раскіданае гняздо» – гісторыяй пра народ, ускрыжаваны на сваёй зямлі, якая здзекуецца і паглынае сваіх дзяцей, бо яны любяць яе. Жанр трагікамедыі прадстаўлены п’есай «Тутэйшыя» – гэта асаблівы роздум аўтара пра гістарычныя шляхі і будучыню беларускага народа. Выданне адрасуецца шырокаму колу чытачоў.




**Купала, Я. Явар і каліна: паэзія кахання: для дзяцей сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту / Янка Купала; укладанне, пасляслоўе С. С. Панізнік; мастак У. П. Масцераў. – Мінск: Юнацтва, 2000. – 219 с.: [8] л. іл**.

У гэты незвычайны зборнік увайшлі вершы і паэмы, у якіх паэтызуюцца пачуцці маладых людзей, рыцарская высакароднасць, чары кахання.

Раздзел «Роздум, здагадкі, успаміны» раскрывае многія патаемныя старонкі жыцця і творчасці вялікага паэта-рамантыка. Інтымны свет, лірыка сусветнага маштабу ўражвае сваёй духоўнай напоўненасцю.

Кніга адрасавана шырокаму колу чытачоў.




**Купала, Я. Паўлінка: камедыя ў 2-х актах / Янка Купала; прадмова П. Васючэнкі. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2006. – 63 с., [8] л. іл.**

**«Паўлінка»** — п'еса Янкі Купалы (камедыя ў двух актах), напісаная ў 1912 годзе. Гісторыя аб тым, як дзяўчына абрала сабе жаніха насуперак бацькоўскай волі. Камедыя шчодра аздоблена нацыянальным каларытам, народным. У фінале п'есы падзеі разгортваюцца драматычна — яе каханага Якіма арыштавалі па даносу бацькі Паўлінкі. Такім чынам, звычайная сямейна-бытавая калізія перарастае ў глыбокі сацыяльна-палітычны канфлікт, а сама п'еса з бытавой камедыі пераўвасабляецца ў сацыяльна-праблемную. Твор будзе цікавы шырокаму колу чытачоў.

## *Паважаныя чытачы!*

Мы шчыра запрашаем Вас пазнаёміцца з
прадстаўленнымі выданнямі ў нашай бібліятэцы.

## *Мы знаходзімся:*

пр-т Жаўтоўскага, 19
(бібліятэка-філіял № 1)

## *Мы працуем:*

панядзелак – пятніца: з 10.00 да 19.00
абедзенны перапынак: з 13.00 да 14.00
нядзеля: з 10.00 да 18.00
субота – ***выхадны***

## *Да сустрэчы!*